# Як пайду я ў стайню




Як пайду я ў стайню
Стайню вайскавую.

Як выведу коня
Коня варанога.

Коня я й сядлаю
А конь уздыхае.

Косю ж ты мой Косю
Чаму ж ты ўздыхаеш.

Ці ж я табе цяжкі
А ці мая зброя.

Ой, ня ты мне цяжкі
А ні твая зброя.

А толькі мне цяжкі
Частыя паязды.

Частыя паязды
Доўгія дарогі.

А сам жа ж ты будзеш
У полі ляжаці.

А мяне пакінеш
Аднаго стаяці.

Як пайду я ў стайню
Стайню вайскавую.

Copyright © Stary Olsa